народнага мастацтва. Задачамі такога даследавання могуць быць:

— выяўленне прынцыпаў арганізацыі фестываляў народнага мастацтва;

— пошук шляхоў захавання, папулярызацыі нацыянальна-культурнай спадчыны ў ходзе арганізацыі і правядзення фестываляў народнага мастацтва.

Такім чынам, фестывалі — гэта не толькі святы наведвальнікаў і ўдзельнікаў, канцэрты для публікі, але і каталізатары абуджэння цікавасці да культуры, нацыянальных звычаяў, традыцый.

Фестывалі патрабуюць навуковага асэнсавання з мэтай удасканалення аспектаў іх арганізацыі, правядзення, дзеля таго каб прынцып "не нашкодзь нацыянальнай культуры, а дапамажы ёй" стаў асноўным у сучасных фестывалях.

**Вышынская І.,**
аспірантка кафедры
сацыялогіі і культуразнаўства

# САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНЫЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ Ў СІСТЭМЕ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ ЯК АДЗІН СА СРОДКАЎ САЦЫЯЛІЗАЦЫІ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ

Культура і чалавек, дыялектыка іх узаемадзеяння займаюць вучоных розных галін навукі. Чалавек па сваёй сутнасці біясацыяльны. З аднаго боку, ён дзіця прыроды, з другога — грамадства, г.зн. соцыуму. Чалавек не нараджаецца сацыяльным, становіцца такім толькі ў працэсе дзейнасці. Ён становіцца чалавекам у поўным сэнсе слова праз культуру. Адукацыя, выхаванне — гэта не што іншае, як авалоданне культурай, працэс перадачы яе ад аднаго пакалення да другога.

Такім чынам, культура абазначае далучэнне чалавека да соцыуму, грамадства. Працэс сацыялізацыі — беспера-



Репозиторий БГУКИ

пыннае авалоданне культурай і разам з тым індывідуалізацыя асобы, бо культуры накладаюцца на канкрэтную індывідуальнасць — характар, псіхічны склад, тэмперамент.

Сёння асабліва відавочна, што для нармальнага існавання грамадства неабходна паўнацэннае, разнастайнае, самаарганізуючае асяроддзе. Менавіта яно з'яўляецца найважнейшым фактарам духоўнага станаўлення і ўдасканалення асобы, яе ідэалаў, інтарэсаў, патрэбнасцей.

Культурнае асяроддзе ўключае сацыяльна-культурныя аб'екты, якія з'яўляюцца носьбітамі культуры і ў якіх узнаўляюцца і распаўсюджваюцца яе элементы.

На сённяшні дзень працэс фарміравання культурнага асяроддзя — "альфа і амега" культурнага абнаўлення, без якога нельга пераадолець дзеяння сацыяльных і псіхалагічных механізмаў, якія раз'ядноўваюць грамадства. Адна з задач, якія зараз стаяць перад грамадствам, заключаецца ў тым, каб зрабіць людзей падрыхтаванымі да ўспрымання культурных каштоўнасцей, валодання ўменнем дакладна вызначаць духоўныя арыенціры.

Успрыманне культуры — заўсёды пэўная напружанасць. Нялёгка ўспрымаць высокія, а можа быць, часам і складаныя духоўныя каштоўнасці.

Вучыць гэтаму трэба з дзіцячага сада, са школы — адным словам, усё жыццё. Фарміраванне асобы ва ўсёй шматграннасці яе сацыякультурнага развіцця, прафесіяналізму, высокай маральнасці з'яўляецца мэтай культуры і абавязковай умовай культурнага прагрэсу. Адну з такіх важных роляў у працэсе духоўнага выхавання іграе адукацыя як працэс, сістэма і інстытут, які забяспечвае засваенне ведаў, арыентацый і вопыту, назапашанага ў грамадстве, іншымі словамі, садзейнічае сацыялізацыі асобы. Менавіта перыяд навучання чалавека ў вышэйшай школе найбольш спрыяльны для яго далучэння да культуры. Як адзначае А.С. Зубра, "... місія вышэйшай навучальнай установы адметная, не параўнальная ні з

Рэпазіторый БГУКІ

чым: "ствараць" чалавека, рыхтаваць яго да жыцця, фарміраваць асобу высокай культуры" (Зубра А.С. Вядучая мэта вышэйшай адукацыі — фарміраванне культуры асобы // Адукацыя і выхаванне. — 1996. — № 5).

Сучасныя тэндэнцыі змянення асноў светапогляду, звязаныя з распадам тэхнагеннай культуры, робяць уплыў на ўсе сістэмы грамадства, уключаючы адукацыю. Больш востра, з-за сваёй спецыфікі, на падобныя змяненні рэагуе сацыяльна-гуманітарная галіна.

У гэтым кантэксце сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны пачынаюць іграць адметную ролю ў сацыялізацыі студэнцкай моладзі.

Гуманітарная адукацыя ставіць праблему цэласнага фарміравання асобы студэнта. "Для гуманітарных навук галоўным з'яўляецца не тое, што ў іх паведамляюцца якія-небудзь звесткі ці законы, на аснове якіх можна рабіць дакладныя прадказанні, а тое, што яны вучаць мастацтву інтэрпрэтацыі, разуменню іншых індывідуальнасці, культуры, гісторыі. Без гэтага сучасная, адукаваная асоба аказваецца страчанай" (Миненков Г.Я. Культурологический контекст образования // Высшая школа: состояние и перспективы. — Мн.: РИВШ БГУ, 1997.).

Неабходная культуралагічна арыентаваная адукацыя, калі кожная з вучэбных дысцыплін, якія вывучаюцца студэнтамі, становіцца прыкладной культуралогіяй.

Сацыяльна-гуманітарная адукацыя як сістэмны элемент зместу падрыхтоўкі спецыяліста павінна ўлічваць тое, што студэнцкая моладзь у адпаведнасці са сваім узростам схільная да сацыяльных змяненняў і фарміравання маральнай свядомасці, да выпрацоўкі цэннасных арыентацый і ідэалаў, устойлівага светапогляду.

Зараз перад сістэмай вышэйшай школы стаіць задача фарміравання спецыяліста новай фармацыі, канкурэнтаздольнага і здатнага вырашаць праблемы з гуманістычных пазіцый, прыдатнага да самастойнай дзейнасці ва ўмовах пастаянных змен. Сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны

Репозиторий БГУКИ

павінны стаць асновай выхавання такой асобы ў вышэйшай школе, як і дысцыпліны, што спрыяюць фарміраванню маральных прынцыпаў, працэсу сацыялізацыі асобы.

**Карнажыцкая Т.В.,**
аспірантка кафедры
сацыялогіі і тэорыі культуры

# АБ НЕАБХОДНАСЦІ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАГА ПОГЛЯДУ НА ПРАБЛЕМУ АДУКАЦЫІ ЯК КУЛЬТУРНАГА РАЗВІЦЦЯ ДЗЯЦЕЙ

Усё часцей вучоныя свету адзначаюць рэальную небяспеку светапогляднага і каштоўнаснага вакууму ў сістэме адукацыі. Характэрнай асаблівасцю сучаснага грамадства з'яўляецца таксама распад шматлікіх формаў традыцыйнай культуры, ва ўмовах якога месца падрастаючага пакалення як суб'екта педагагічнага ўздзеяння розных грамадскіх інстытутаў з мэтай фарміравання асобы вызначана загадзя. Глыбінныя макрасацыяльныя працэсы, што адбываюцца ў грамадстве, выклікаюць неабходнасць у змяненні асноўных педагагічных парадыгмаў, у абнаўленні нацыянальнай культурна-асветнай сістэмы. Патэнцыял, які дазваляе больш інтэнсіўна і непасрэдна ўздзейнічаць на працэсы дэмакратызацыі і гуманізацыі ў адукацыйнай сферы, закладзены ў маладой навуцы — культуралогіі. Перасоўванне акцэнтаў з засваення гатовых ведаў на ўменне мысліць гнутка і творча, а таксама магчымасць убачыць і ацаніць стан дзяцінства як суб'екта культуры адкрываюць культуралогіі шырокія шляхі ў сістэме адукацыі. Вывучэнне культуралогіі дазволіць ацаніць стан культурнага ўзроўню сучаснага дзяцінства, а таксама ўмовы фарміравання асяроддзя, якое павінна садзейнічаць уваходжанню дзіцяці ў свет культуры грамадства, сацыялізацыі асобы. Уключэнне культуралогіі ў сістэму